# ПРЭЗІДЭНТ ПАДТРЫМАЎ НАМЕР УРАДА ПАВЯЛІЧЫЦЬ ПЛОШЧЫ АЗІМАЙ СЯЎБЫ

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка 18 жніўня прыняў прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь С. С. Лінга.**

Як паведаміла прэс-служба кіраўніка дзяржавы, прэзідэнту краіны далажана аб ходзе завяршэння ўборачнай. Прэм'ер-міністр адзначыў, што з-за неспрыяльных умоў надвор'я і іншых аб'ектыўных абставінаў валавы збор збожжа ў гэтым годзе будзе ніжэй за ўзровень папярэдняга года. Дзяржава будзе вымушана ажыццяўляць закупкі збожжа за мяжой. Прэзідэнт даў даручэнне кіраўніку ўрада зрабіць аналіз дапушчаных у ходзе сяўбы памылак і адначасова падтрымаў намер урада павялічыць плошчы азімай сяўбы ў рэспубліцы.

Прэзідэнту таксама далажана аб ходзе назапашвання кармоў. Па гэтаму паказчыку ў хуткім часе будзе дасягнуты ўзровень мінулага года. У сувязі з гэтым А. Р. Лукашэнка звярнуў увагу С. С. Лінга на недапушчальнасць зніжэння пагалоўя жывёлы.

У ходзе гутаркі адзначалася, што напружанне ў эканамічнай сферы, а таксама неспрыяльныя ўмовы надвор'я не могуць не адбіцца на дзяржаўным бюджэце. Паводле слоў прэзідэнта, неабходны рэжым жорсткай эканоміі ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі. Як адзначыў прэм'ер-міністр, будуць скарочаны ўсе дзяржаўныя расходы, за выключэннем тых, што адносяцца да сацыяльнай сферы.

На сустрэчы разгледжана сітуацыя, якая складваецца ў галіне фінансаў і крэдытна-грашовай палітыкі. Было адзначана, што ўзровень інфляцыі ў краіне пакуль яшчэ вялікі, аднак на працягу трох апошніх месяцаў рост рэальнай зарплаты крыху апярэджваў інфляцыю. Прэзідэнт указаў кіраўніку ўрада на тое, што прагнозныя паказчыкі развіцця краіны ў гэтым годзе павінны быць выкананы ў поўным аб'ёме.

**БЕЛТА.**

Нацыянальная бібліятэка Беларусі